ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

# Архіварыус

*Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў*

## Выпуск 17

Мінск
НГАБ
2019

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Рэдакцыйная калегія:
*Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў* (галоўны рэдактар), *У. М. Дзянісаў, К. Ю. Ерусалімскі, В. І. Кураш, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык* (адказны рэдактар), *А. Рахуба, А. Я. Рыбакоў, А. Л. Самовіч, В. В. Урублеўскі, М. Ф. Шумейка, Д. У. Яцэвіч*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук *А. І. Груша,*
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 года № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2019

*Д. В. Лісейчыкаў*

# «Сооружены ест коштом и накладом отца Константына»: срэбраны напрастольны крыж з Новагародка і лёс яго стваральніка

У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь (далей – НГМРБ) у калекцыі «Каштоўныя металы і камяні» захоўваецца напрастольны крыж [21] [1] (гл. іл. 1, 2). Апошнім часам ён актыўна запатрабаваны ў экспазіцыйнай дзейнасці. У прыватнасці, у 2014 г. крыж экспанаваўся ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь на выставе «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» ў раздзеле «Візантыйскія традыцыі» [5]. У 2017 г. ён экспанаваўся на выставе «Ultima ratio regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.» у Музеі замкавага комплексу «Мір» [4, с. 174–175], дзе быў няслушна атрыбутаваны як праваслаўны. Тэхнічныя характарыстыкі крыжа наступныя. Памеры складаюць 37,5×17,5 см. Вага – 500 г. Ён выраблены з дрэва і пакрыты ліставым срэбрам 800–875 пробы з кветкавым і лінейным арнаментам. Тэхніка выканання – чаканка, ліццё, гравіроўка. На крыжы маецца лаканічны ўкладны запіс, змест якога наступны: «Сеи кре*ст* соѡрꙋжены е*ст* ко*ш*то*м* і накладо*м* ѿца Ко*н*стан*т*|ына, протопопы но*в*горо*д*[ского], ро*к*[у] ҂ахке [1625], м[еся]ца априлѧ | в [2] днѧ. Того *ж* ро*к*[у] пре*с*тависꙗ м[еся]ца ноѧ*б*р[я] е [5] днѧ. | Да*и*, Г[оспо]ді, емꙋ Ц[а]р*ст*во Н[е]б[е]*с*ное» (гл. іл. 3). Атрыбутаваць прадмет, прасачыць гісторыю яго стварэння і перамяшчэння, ідэнтыфікаваць асобу ахвярадаўцы дапамаглі архіўныя дакументы.

Першай зачэпкай паслужыла ўзгадка асобы новагародскага пратапопа айца Канстанціна, які ахвяраваў гэты крыж да неназванай царквы (верагодна, у г. Новагародку) у 1625 г. незадоўга да сваёй смерці. Як вынікае са зместу запісу, ён быў зроблены не самім святаром, а яго наступнікам. Лагічна будзе выказаць здагадку, што айцец Канстанцін ахвяраваў крыж да царквы, пры якой служыў сам. Але да якой канкрэтна? Як вядома, да падзей вайны 1654–1667 гг. у г. Новагародку дзейнічала некалькі цэркваў, на той час ужо ўніяцкіх. Усе дзеючыя на той час цэрквы ў горадзе пералічваюцца ў тастаменце сына мінскага харужага Мікалая Корсака ад 27 верасня 1657 г. Гэта мураваныя цэрквы Св. Барыса і Глеба і Прасвятой Багародзіцы (апошняя – у Замку), а таксама драўляныя Уваскрэсення Божага, Св. Яна Хрысціцеля і Св. Мікалая [18,

[1] Выказваю шчырую падзяку за дапамогу ў зборы матэрыялаў **Але Забялінскай, Вользе Клецкінай, Мікалаю Нікалаеву, Валерыю Пазднякову, Людміле Талкачовай** і **Галіне Флікоп-Світа**.




Іл. 1. Срэбраны напрастольны крыж з г. Навагародка (вонкавы бок)



Іл. 2. Срэбраны напрастольны крыж з г. Навагародка (адваротны бок)

арк. 440 адв.–441]. Першая належала да юрысдыкцыі базыльянскага ордэна, астатнія з’яўляліся звычайнымі парафіяльнымі. Царкву Св. Мікалая Корсак у сваім тастаменце вылучыў асобна – ён называе яе царквой *«майго патрона»*, г. зн. нябеснага заступніка Св. Мікалая.

Візіты 1680 г. згадваюць толькі адну дзейную парафіяльную царкву ў г. Навагародку – Уваскрэсення Божага. Астатнія, за выключэннем базыльянскай царквы Св. Барыса і Глеба, пасля падзей вайны 1654–1667 гг., верагодна, яшчэ знаходзіліся ў запусценні. Пры Уваскрэсенскай царкве адзначана наяўнасць нейкага срэбранага крыжа, аднак сам змест запісу (*«срэбраны крыж»* [8, с. 100]) занадта лаканічны, каб з дакладнасцю сцвярджаць, што гаворка ідзе менавіта аб гэтым крыжы.

З пратакола візітацыі Навагародскага базыльянскага манастыра ад 27 лютага 1705 г. даведваемся, што ў той час крыж ужо захоўваўся пры мураванай манастырскай царкве Св. Барыса і Глеба. Праўда, яго апісанню адводзіцца даволі сціплае месца сярод іншых срэбраных прадметаў: *«белы срэбраны крыж, на якім Госпад Хрыстос і пазалочаныя евангелісты»* [27, арк. 148 адв.]. Відавочна, крыж быў далёка не самай вялікай каштоўнасцю ў манастыры. Але з якога храма ён трапіў да навагародскіх базыльянаў?

Падрабязны спіс каштоўных рэчаў, якія былі забраны навагародскімі базыльянамі з будынкаў астатніх гарадскіх парафіяльных храмаў, падаюць генеральныя візіты цэркваў Св. Мікалая і Св. Яна за 1754 г. З царквы Св. Яна *«срэбраны келіх з Евангеллем, друкаваным in folio, іх мосці айцы базыльяне Навагародскага манастыра да сябе забралі»* [17, арк. 3], з царквы Св. Мікалая *«таксама срэбра, якое іх мосці айцы базыльяне Навагародскага манастыра да сябе забралі – вялікая чатырохгранная срэбраная звяздзіца, вялікі срэбраны крыж з пазалочаным укрыжаваннем гвалтоўна з царквы ўзялі»* [17, арк. 2]. Рэфармацыйны дэкрэт да тых жа візітаў загадваў святарам прыкласці намаганні па вяртанні страчанага крыжа з манастырскай царквы ў парафіяльную [17, арк. 2 адв.]. Такім чынам, мы бачым, што першапачаткова крыж быў ахвяраваны да Навагародскай царквы Св. Мікалая, якая ў першай палове XVII ст., верагодна, і з’яўлялася «вотчынай» пратапопа Канстанціна.

Аб гэтым наўпрост гаворыцца ў рэфармацыйным дэкрэце, складзеным у час генеральнай візітацыі царквы Св. Мікалая ў г. Навагародку ад 16 студзеня 1784 г. Дэкрэт таксама падрабязна апісвае матэрыял, з якога быў выкананы крыж, у прыватнасці, згадвае яго кіпарысавую аснову: *«Да таго ж вялікі кіпарысавы крыж, пакрыты срэбранай бляхай з надпісам, прыдбаны да царквы Святога Мікалая, нададзены да гэтай жа царквы ад вялебнага святара Краскевіча, навагародскага дэкана* [пасада пратапопа пададзена ў варыянце, характэрным для лацінскай традыцыі. – *Д.Л.*]*, а ад гэтага часу ў вялебных айцоў навагародскіх базылья-*



Іл. 3. Укладны надпіс на крыжы

*наў невядома з якой нагоды і падставы ўтрымліваецца. Для вяртання якога нават праз вэрхал пад пагрозай пакарання загадваю, каб вялебны святар настаяцель прыклаў намаганні»* [14, арк. 1].

Падаўчы інвентар ад 3 сакавіка 1795 г., які быў складзены пры перадачы царквы Св. Мікалая ў часовую адміністрацыю святару Іосіфу Станкевічу, сярод «начыння для працэсій» згадвае 2 працэсійныя крыжы, *«адзін з драўляным укрыжаваннем, а другі мае на сабе пафарбаваную фігуру Госпада Ісуса, і аднаго не стае, паводле рэестру святар адміністратар павінен папракнуць айцоў базыльянаў»* [3, арк. 35 адв.]. Дэканская візіта царквы Св. Мікалая ад 5 ліпеня 1801 г. [3, арк. 87 адв.] апісвае храм, адбудаваны нанова пасля нядаўняга пажару, але пра крыж ужо не ўзгадвае.

Затое падрабязнае апісанне крыжа мае генеральная візіта Навагародскага базыльянскага манастыра і царквы Св. Барыса і Глеба ад 15 ліпеня 1824 г. Пры апісанні вырабаў з каштоўных металаў, якія знаходзіліся пры царкве, адзначаны *«срэбраны ручны крыж, гравіраваны з абодвух бакоў, які мае з аднаго боку пазалочанае ўкрыжаванне і чатыры такія ж фігуркі, з другога боку – зеленаваты сібірскі камень. [Крыж] 10-й пробы, важыць 1 фунт»* [19, арк. 11]. Пад тэрмінам *«сібірскі камень»* маецца на ўвазе малахіт, які і сёння знаходзіцца ўсярэдзіне крыжа (Гл. іл. 3). Якасць срэбра, з якога выраблены крыж, пададзена відавочна ў выглядзе лотавай пробы. Пры пераводзе лотавай сістэмы на метрычную атрымліваецца, што крыж мае 625 пробу срэбра (у сучаснай музейнай дакументацыі проба матэрыялу крыжа вызначана як 800–875).

З прыведзеных прыкладаў мы можам даведацца нарэшце не толькі пра храм-адрасат, але і пра прозвішча ахвярадаўцы, навагародскага пратапопа Канстанціна – *Краскевіч*. Тое, што прозвішча святара адсутнічае ў арыгінальным тэксце запісу 1625 г., а пазнейшыя крыніцы яго фіксуюць – звыклая для таго часу практыка. З’яўленню і асаблівасцям фіксацыі ўстойлівых прозвішчаў у святароў у XVII ст. прысвечаны падраздзел *«Фарміраванне святарскіх дынастый»* у адной з нашых прац

[10, с. 20–28]. У той час у дачыненні да святароў практыкавалася выкарыстанне і імёнаў па бацьку. Тое самае мы назіраем і ў гэтым выпадку. У дакументах, якія датуюцца 2–17 студзеня 1596 г. [23, арк. 7–7 адв.], 17 чэрвеня 1609 г. [24, арк. 1–1 адв.] і 25 ліпеня 1609 г. [6, с. 157], навагародскі пратапоп фігуруе як *Канстанцін Грыгор'евіч* (без фіксацыі ўстойлівага прозвішча).

Са зместу запісу на крыжы вынікае, што ён быў нанесены не самім айцом Канстанцінам, а яго наступнікам, прычым пасля смерці ахвярадаўцы, які *«того ж [1625] року преставися»*. Пытанне – наколькі пазней за пазначаную на крыжы дату быў зроблены гэты надпіс? На год–два ці можа на пяць–дзесяць? Справа ў тым, што дата на крыжы можа быць памылковай. Да нашага часу захаваўся дакумент першай трэці XVII ст. аб передачы мітрапаліцкага маёнтка Печураны Новагародскага павета ў валоданне Новагародскай капітуле (калегіяльнаму органу пры кафедральнай царкве). Ад імя капітулы дакумент падпісаў яе кіраўнік – навагародскі пратапоп Канстанцін Краскевіч [25]. Праблема ў тым, што дакумент датуецца 28 студзеня 1631 г. Магчыма, што крыж быў выраблены і ахвяраваны храму пазней, як варыянт – у 1635 г. У адваротным выпадку давядзецца дапусціць, што ў Новагародку ў розныя гады было два пратапопа Канстанціна – напрыклад, бацька Канстацін Грыгор'евіч і сын Канстанцін Канстанцінавіч. Але ў такім выпадку лагічна будзе дапусціць, што аўтар надпісу на крыжы не забыў бы пазначыць і імя па бацьку ахвярадаўцы, каб пазбегнуць блытаніны.

Цікава, што ў зборах НГМРБ захоўваецца яшчэ адзін прадмет, звязаны з новагародскімі цэрквамі, праўда, крыху ранейшага перыяду. Апасродкавана ён можа мець сувязь і з галоўным героем нашага артыкула. Гэта срэбраны пазалочаны пацір (літургічны келіх) сярэдзіны альбо другой паловы XVI ст. з укладным запісам наступнага зместу: «Ἰ[ησοῦ]ς † [2] Χ[ριστό]ς. Сїи потирь и дискосъ и с *н*ѣи и ильжицꙋ рабъ Божїи Григореи Щоко*т* да*л* в ц(е)рко*в* соборнꙋю Пр(е)ч(и)*с*тое Б(огороди)ци в Новѣгородкꙋ Лито*в*ско*м*. Б(о)же, бу*д* м(и)л(ос)ти*в* д(у)ши е*г*(о)» [20]. З тэксту вынікае, што на момант ахвяравання келіха саборнай царквой у горадзе лічыўся храм Прачыстай Багародзіцы на Замку (а не мураваная царква Св. Барыса і Глеба, як прынята лічыць). Верагодна, у канцы XVII ст., калі Замкавая царква перайшла пад юрысдыкцыю навагародскіх базыльянаў, усё дарагое начынне было перанесена ў царкву Св. Барыса і Глеба. Ахвяраванне Грыгорыя Шчоката ў поўным камплекце (разам з узгаданымі ў запісе дыскасам, звяздзіцай і лыжачкай) апісана ў візіце Новагародскага базыльянскага манастыра ад 25 лютага 1705 г.: *«Старасвецкі келіх, срэбраны і цалкам пазалочаны, з вежачкамі і роз-*

[2] Выява крыжа-галгофы.



Іл. 4. Аўтограф новагародскага пратапопа Канстанціна Грыгор’евіча.
17 студзеня 1596 г.

*нымі кветкамі. Да яго дыскас, зверху пазалочаны. Звяздзіца і лыжачка такая ж»* [27, арк. 148 адв.]. Апрача гэтага, нашу ўвагу прыцягнула імя ахвярадаўцы – *Грыгорый*. Ці не мог гэты выключна заможны ахвярадаўца з’яўляцца бацькам *Канстанціна Грыгор’евіча*? Вядома, што ён быў свецкай асобай (гэта вынікае з запісу), верагодна, мешчанінам і меў асаблівую пабожнасць – паколькі здзейсніў на карысць царквы такое вялікае ахвяраванне. У сярэдзіне і канцы XVI ст. многія свецкія асобы «грэцкай рэлігіі» – і баяры, і зямяне, і мяшчане – абіралі для сябе духоўную кар’еру нават толькі з меркантыльных прычын (падрабязней гл. наш артыкул [11]). Тое, што за Канстанцінам Грыгор’евічам і яго нашчадкамі з сярэдзіны XVII ст. замацавалася ўстойлівае прозвішча *Краскевіч*, зусім не адмяняе верагоднасці, што ў яго імаверных продкаў-мяшчан магло быць іншае прозвішча-мянушка. Безумоўна, гэта толькі гіпотэза, якая, аднак, дазваляе патлумачыць, чаму ў 1609 г. у часе спрэчак з мітрапалітам Іпаціем Пацеем Канстанцін Грыгор’евіч быў пакліканы не на мітрапаліцкі суд, як духоўная асоба, а *«яко мещанин Новгородскии»* [24, арк. 1 адв.] на задворны асэсарскі суд у Вільню (гл. ніжэй).

Адна з першых узгадак аб асобе айца Канстанціна датуецца 22 сакавіка 1594 г. [23]. У гэты час ішла барацьба паміж мітрапалітам Кіеўскім, Галіцкім і ўсёй Русі Міхаілам Рагозам і архімандрытам Нікіфарам Турам за ўладу над Кіева-Пячэрскім манастыром і манастырскімі маёнткамі. 22 сакавіка 1594 г. і 2 студзеня 1596 г. позвы Нікіфару Туру з’явіцца на духоўны мітрапаліцкі суд, які, як меркавалася, адбудзецца

ў Новагародку, дастаўляў у Кіеў менавіта святар новагародскай саборнай царквы (якой на гэты час з'яўлялася ўжо царква Св. Барыса і Глеба) Канстанцін Грыгор'евіч [23, арк. 7–7 адв.]. Першы раз, у 1594 г., Нікіфар Тур адказаў айцу Канстанціну: *«Отцу митрополиту ничого до меня, нехай он дозирает порядку в Новагородку, а не тут»*. Другі раз Нікіфар Тур таксама не захацеў прымаць позву, і 17 студзеня 1596 г. айцец Канстанцін пакінуў уласнаручны запіс аб тым, што *«тот позов <...> положонъ и уткнен у ворота манастыра Печерского и черньцом оповедан»* [23, арк. 7 адв.] (Гл. іл. 4). Гэтай жа справы, відаць, тычылася і складзенае Канстанцінам Грыгор'евічам сазнанне ад 10 кастрычніка 1594 г., змест якога, на жаль, невядомы [26, с. 77].

Наступны сюжэт, звязаны з айцом Канстанцінам, фіксуецца ў дакументах ужо «пасляўніяцкага» перыяду (г. зн. пасля заключэння Брэсцкай уніі 1596 г.). Па-першае, у адным з дакументаў ад 8 красавіка 1601 г. Канстанцін Грыгор'евіч названы *«пятніцкім святаром»* [26, с. 180] (г. зн. святаром царквы Св. Параскевы Пятніцы). Па ўсёй верагоднасці, у гэты час ён ужо не з'яўляўся святаром саборнай царквы Св. Барыса і Глеба. Рашэнне аб адхіленні альбо аб перамяшчэнні яго ад пасады пры царкве, ды яшчэ і пры саборнай, мог прыняць толькі мітрапаліт, якім на той час з'яўляўся Іпацій Пацей. Такое дапушчэнне пацвярджаецца дакументальна.

У пачатку XVII ст. у структурах Кіеўскай мітраполіі на землях Вялікага Княства Літоўскага абвастрылася барацьба супраць узмацнення епіскапскай улады, якая абцяжарвалася тым, што большасць іерархаў «грэцкага абраду» вызнала унію з Рымам. Такім чынам барацьба з уладай царкоўнай іерархіі, якая распачалася яшчэ ў другой палове XVI ст., набывала дадатковую ідэалагічную афарбоўку, якая з кожным дзесяцігоддзем усё больш выходзіла на пярэдні план. Супернікам моцнай і цэнтралізаванай улады епіскапата выступала частка арыстакратыі, але найбольш значнай сілай былі аб'яднаныя ў брацтвы мяшчане і духавенства «грэцкага абраду» буйных гарадоў. Самыя актыўныя праціўнікі ўніяцкага мітрапаліта Іпацыя Пацея на тэрыторыі т. зв. «Літоўскай» часткі Кіеўска-Віленскай мітрапаліцкай епархіі [3] былі сканцэнтраваны ў чатырох найбольш важных гарадах епархіі: Вільні, Гародні, Менску і Новагародку. Новагародскай групай мітрапалітавых апанентаў кіраваў ніхто іншы, як мясцовы пратапоп Канстанцін Грыгор'евіч [2, s. 281].

Сутнасць канфліктаў з духавенствам яскрава апісаў сам Іпацій Пацей у сваім пасланні да віленскіх мяшчан ад 18 верасня 1608 г., дзе га-

---

[3] У склад «Літоўскай» часткі Кіеўска-Віленскай епархіі ўваходзілі цэрквы на тэрыторыі Менскага, Новагародскага, Троцкага і Віленскага ваяводстваў (за выключэннем Браслаўскага павета, які адносіўся да юрысдыкцыі Полацкай архіепархіі).

ворка, між іншым, ішла і пра асобу новагародскага пратапопа: *«Кгдыж мало не <...> во всих головных местах хотяж суть протопопове, але не мають от мене таковое владзы, жебы хто других собе ровных догледати мел без особливого порученья и листу моего, и в римской церкви суть деканове, што у нас и протопопове, але есм особливый офицыал, который поезджает и визытует по всей диоцезыи епископства оного, бо певне протопопа Виленский не похочет слухати протопопы Новгородского, ани Новгородский Виленского, также в Менску, в Городне, в Волковыйску и индей кождей речет, жесмы собе ровные, а посполите наболей з старших великие суть соблазны и другим меншим деются. Про то сам розум показует, же потреба одного, который бы вместо екзархи был, жебы в небытности моей в тамтых краях поежджаючы по епархии погледал порядка церковного, на который вряд потреба человека зацного, в Писме Светом и в правилах церковных досконале учоного, на которого бы ся теж и люди огледати и в прыстойном пошанованью яко шляхтича зацне врожоного мели, кгдыж люде сего веку болшей теперь на зацность сегосветную огледаются, а нижли на стан духовный»* [6, с. 112–114].

Пасля няўдалага працэсу ў Галоўным Трыбунале Вялікага Княства Літоўскага супраць гарадзенскай групы сваіх праціўнікаў мітрапаліт Пацей 17 чэрвеня 1609 г. [24, арк. 1–1 адв.] падаў позву на Канстанціна Грыгор'евіча ў задворны асэсарскі суд. У судовай позве апісвалася тое, у чым мітрапаліт вінаваціў непаслухмянага святара. Некалькі дзён таму, 15 чэрвеня 1609 г., Іпацій Пацей прыехаў у Новагародак *«до столицы своее аръхиепископъское, которую од летъ десети в спокоиномъ держаню мел»* [24, арк. 1]. Ён пайшоў на набажэнства да сабορнай царквы Св. Барыса і Глеба, дзе меркаваў застаць айца Канстанціна. Але аказалася, што пратапоп разам з нейкім збеглым манахам Паўлам сабраў мяшчан у будынку новай, яшчэ неасвечанай царквы Св. Тройцы. У тую царкву быў пасланы мітрапаліцкі архідыякан Антоній з мэтай прымусіць Канстанціна Грыгор'евіча прадстаць перад Пацеем і трымаць перад ім справаздачу *«о порядках церкви Божое и о иных речах, яко о скарбехъ церковных, о листах и о привиляхъ митрополии и его милости самому належачых»* [24, арк. 1]. Адмову айца Канстанціна архідыякан перадаў амаль даслоўна. Пратапоп звярнуўся да сабранай грамады са словамі: *«О то мене пан Потеи до себе зовет, не выдаваите мене»* [24, арк. 1]. Не жадаючы эскалацыі канфлікту (*«постерегаючи покою посполитого, жебы якое замешане за тым не сталося»* [24, арк. 1]), мітрапаліт не стаў ужываць да пратапопа сілу, а паклікаў яго, як жыхара каралеўскага горада Навагародка (*«яко мещанин Новгородскии»* [24, арк. 1 адв.]), на задворны асэсарскі суд у Вільню.

У адрозненне ад судовага працэсу з гарадзенскай групай сваіх апанентаў, у гэты раз абставіны для мітрапаліта склаліся ўдала. Кароль Жыгімонт III перад вайсковай выправай пад Смаленск у ліпені–жніўні 1609 г. некалькі тыдняў якраз праводзіў у Вільні. Пачаў свае пасяджэнні задворны асэсарскі суд. Асабістая прысутнасць караля і той факт, што судовымі пасяджэннямі кіраваў прыхільнік Іпація Пацея – вялікі канцлер Леў Сапега – паспрыялі таму, што ўсе пытанні былі вырашаны на карысць мітрапаліта [2, s. 287]. Апошняму таксама давалася магчымасць паступіць з Канстанцінам Грыгор'евічам у залежнасці ад далейшых паводзін: прабачыць альбо пакараць. У такіх абставінах 25 ліпеня 1609 г. быў складзены цікавы дакумент – своеасаблівая дэкларацыя паслушэнства духавенства мітрапаліту Пацею, якую, сярод іншых, падпісаў і айцец Канстанцін [6, с. 157]. Расійскі гісторык П. Жуковіч звярнуў увагу на той факт, што ў гэтым дакуменце айцец Канстанцін называе сябе навагародскім пратапопам, але на такой жа пасадзе там фігуруе і Ларыён Агеевіч [9, арк. 370]. Верагодна, на той час мітрапалітам ужо быў прызначаны новы пратапоп і такое «кадравае рашэнне» Пацея было не апошняй прычынай, праз якую Канстанцін Грыгор'евіч падпісаў дэкларацыю паслушэнства.

На жаль, нам не ўдалося выявіць дакументаў, у якіх бы ўзгадвалася постаць айца Канстанціна і апісвалася яго дзейнасць у 1610–1620-я гг. Як чалавек свайго часу, былы бунтар мусіў цяжка перажываць сваё непаслушэнства мітрапаліту. Магчыма, замова і ахвяраванне на царкву надзвычай каштоўнага напрастольнага крыжа былі своеасаблівай спробай ачысткі сумлення ад цяжкага для святара граху непаслушэнства іерархіі. Цалкам магчыма, што адносіны з наступным мітрапалітам (з 1614 г.) земляком-навагародцам Іосіфам Вельямінам-Руцкім у айца Канстанціна былі ўжо больш прыязнымі. Аднак, як падаецца, невыпадковым можа быць і год стварэння крыжа – 1625. Гэты год, як вядома, быў абвешчаны Рымскім Папам Урбанам VIII юбілейным. У юбілейныя гады можна было атрымаць дараванне грахоў пры выкананні пэўных умоў. Верагодна, пасля забойства ў 1623 г. у г. Віцебску полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, якое скаланула не толькі Рэч Паспалітую, але і ўсю Еўропу, айцец Канстанцін асабліва востра зразумеў, да якіх наступстваў мог прывесці яго бунт супраць царкоўнай іерархіі.

Як сведчаць іншыя крыніцы, святарскі род Краскевічаў у XVII ст. сапраўды адзначаны на духоўных пасадах у г. Навагародку. Так, вядома, што святаром «Прачысценскай» (Замкавай) царквы ў г. Навагародку 4 студзеня 1643 г. быў нехта Павел Краскевіч [12, с. 411; 16, арк. 17–18], верагодна, сын айца Канстанціна. З апісання царкоўнага начыння царквы Св. Барыса і Глеба 1879 г. можна даведацца аб тым, што айцец Павел

займаў гэтую пасаду і пазней. Цудатворны абраз Багародзіцы [падрабязней аб гісторыі стварэння абраза гл.: 1, s. 150–154], які знаходзіўся ў царкве, змяшчаў дароўны запіс наступнага зместу: «Року 1654 мѣсяца Іануарія 25 дня. За стараніемъ Ч(естного) О(тца) Павла Крисковича, Протопопа Новогрудскаго, Пресвитера церкви Пречистой Богородицы, и коштомъ Іоанна Романовича сей образъ поставленъ есть» [22, с. 15]. Згадкі аб новагародскім пратапопе Паўле Краскевічу маюцца і ў шэрагу дакументаў, датаваных 1663 і 1672 гг. [26, с. 185]. Прычым са зместу дакумента ад 9 мая 1663 г. можна зразумець, што ў падпарадкаванні Паўла Краскевіча знаходзілася яшчэ і царква Св. Мікалая [26, с. 185]. Цалкам магчыма, што царква Св. Мікалая, да якой першапачаткова быў ахвяраваны крыж, з'яўлялася па-сутнасці прыпісной да мураванай «Прачысценскай» (Замкавай) царквы, якая да таго ж у XVI ст. мела статус саборнай.

З прыведзеных звестак мы таксама бачым, што нават пасада пратапопа ў XVII ст. была па-сутнасці спадчыннай. Гэта ў цэлым суадносіцца з вынікамі нашых даследаванняў па іншых тэрыторыях Вялікага Княства Літоўскага за гэты перыяд.

Такім чынам, як падаецца, удалося ўстанавіць ланцужок, які звязвае новагародскіх пратапопаў Канстанціна Грыгор'евіча і Паўла Краскевіча, а таксама царкву Св. Мікалая з «Прачысценскай» царквой на Замку. Крыж быў ахвяраваны царкве Св. Мікалая Канстанцінам Грыгор'евічам і захоўваўся тут да падзей вайны 1654–1667 гг., у тым ліку ў першыя гады кіравання царквой Паўлам Краскевічам. Пасля вайны крыж верагодна, быў перанесены айцом Паўлам у мураваную «Прачысценскую» (Замкавую) царкву, якая таксама знаходзілася ў яго падпарадкаванні, і перажыла вайну відавочна лепей за драўляную Мікалаеўскую. У канцы XVII ст. Замкавая царква перайшла пад юрысдыкцыю новагародскіх базыльянаў. Верагодна, гэта адбылося пасля смерці Паўла Краскевіча – у апошнія два дзесяцігоддзі XVII ст. альбо ў першыя гады XVIII ст. (да 1705 г.). Разам з будынкам Замкавай царквы да базыльян перайшло і ўсё яе начынне, хоць гэта і спрабавалі аспрэчваць прадстаўнікі мітрапаліта і белага новагародскага духавенства.

Знаходжанне крыжа ў руках базыльянаў знайшло адлюстраванне і на яго знешнім выглядзе. Агляд рэліквіі дазваляе заўважыць, што дзеля надання крыжу выгляду, які больш адпавядае традыцыям Заходняй Царквы, ад пазалочанай фігуры Хрыста быў адламаны німб, а з сярэдзіны крыжа выдалена выява чэрапа і касцей (відавочна, таксама пазалочаных). Верагодна, гэта адбылося ў XVIII ст., бо візіта 1824 г., якая падрабязна апісвае крыж і ўзгадвае наяўнасць на ім пазалочанага ўкрыжавання і чатырох фігурак, не згадвае наяўнасці на ім іншых пазалочаных элементаў [19, арк. 11].

Пасля пераносу крыжа ў царкву Св. Барыса і Глеба ён заставаўся там аж да 60-х гг. XX ст. У 1757 г. базыльяне распачалі працы па пашырэнні і ўпрыгожанні Замкавай царквы з мэтай паляпшэння ўмоў для захавання цудатворнага абраза Божай Маці, які месціўся тут [13, арк. 14–15], аднак крыж туды не вярнуўся. Генеральныя візіты трох парафіяльных навагародскіх цэркваў 1798 г. ні словам не згадваюць аб месцы знаходжання крыжа [7, с. 109–113] і ўжо не ўтрымліваюць патрабаванняў аб вяртанні яго на сваё законнае месца. Рамонтныя работы сярэдзіны XVIII ст. далі мала плёну, і да канца стагоддзя будынак Замкавай царквы канчаткова прыйшоў у заняпад. Пляц з парэшткамі навагародскага замка, а таксама Замкавай царквы двойчы выстаўляўся на аўкцыён – 4 снежня 1858 г. і 26 лютага 1859 г. – пасля чаго яго купіў навагародскі мешчанін, лекар Альбін Карповіч. На той час, як можна меркаваць, ад царквы засталіся толькі падмуркі, сама ж яна была разабрана мяшчанамі на цэглу: *«На Замковай гары насупраць пабудаваных згарэлых дамоў бургамістра Юрыя Чарнікевіча, узведзенага каменнага млыну памешчыка Пальчэўскага і дома дваранкі Паўловіч знаходзіцца пустая мясцовасць, абмежаваная ярам, дзе была некалі разабраная Васільянская царква»* [13, арк. 9–9 адв.].

У пачатку XX ст. да заняпаду прыйшоў і будынак царквы Св. Барыса і Глеба. 9 мая 1913 г. на сходзе Новагародскага Свята-Мікалаеўскага прыходскага брацтва быў створаны адмысловы «Камітэт па рэстаўрацыі Барыса-Глебскага храма ў горадзе Новагародку» [15, арк. 3]. З-за хуткага пачатку Першай сусветнай вайны Камітэт не паспеў разгарнуць шырокай дзейнасці. Удалося сабраць толькі некаторыя сродкі на вядзенне рэстаўрацыйных работ і ў маі 1914 г. правесці агляд будынка царквы і царкоўнага начыння. Агляд праводзіў вядомы навуковец, старшыня Камісіі па кіраванні Віленскай публічнай бібліятэкі і музея Д. І. Даўгяла. Між іншым, было занатавана, што сярод рэчаў маецца ў наяўнасці *«абкладзены срэбрам напрастольны крыж з надпісам: «Сей крест сооружен коштом и накладом отца Константина протопопы Новогрудского року 1625 апреля 12*[4] *дня»* [15, арк. 17]. Настаяцель царквы Св. Барыса і Глеба Лаўр Кляеўскі адзначыў, што *«ў крыжы, відавочна, змешчаны часткі святых мошчаў»* [15, арк. 17]. Крыж знаходзіўся ў будынку царквы да 1963 г. Паводле акта ад 26 студзеня 1963 г., падпісанага старшынёй выканаўчага камітэта Навагрудскага гарадскога савета Аляксандрам Васільевічам Голубевым, старшым навуковым супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея Варатніцкай (імя не пазначана) і прадстаўніком царкоўнага

[4] Д. І. Даўгяла альбо настаяцель царквы Лаўр Кляеўскі (які цытуе заключэнне Даўгялы) памыліўся: на крыжы пазначана дата 2 красавіка.

савета (подпіс неразборлівы), крыж паступіў на захаванне ў названы музей.

Такім чынам, найбольш верагодна, што гэты каштоўны напрастольны крыж быў ахвяраваны царкве Св. Мікалая ў г. Навагародку пратапопам Канстанцінам Грыгор'евічам у 1625 г. Айцец Канстанцін уваходзіў у склад кліраcу кафедральнай саборнай царквы ў г. Навагародку – дэ-факто на той час галоўнага храма Кіеўскай мітраполіі. У канцы XVI ст. ён выконваў важныя даручэнні мітрапаліта Міхаіла Рагозы. У самым пачатку XVII ст. айцец Канстанцін з'яўляўся кіраўніком навагародскай групы духавенства і мяшчан, якія выступалі супраць улады новага мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і ўсёй Русі Іпація Пацея. Непадпарадкаванне духавенства сваёй іерархіі набывала рысы міжканфесійнага канфлікту, паколькі пасля заключэння Брэсцкай уніі ў 1596 г. супраць епіскапату Кіеўскай мітраполіі, які амаль у поўным складзе вызнаў уладу Папы Рымскага, выступілі брацтвы і духавенства буйных гарадоў, а таксама частка арыстакратыі. Аднак дзякуючы ўмелым дзеянням мітрапаліта канфлікт у Навагародку хутка быў улагоджаны. Пасля прымірэння з Пацеем у 1609 г. Канстанцін Грыгор'евіч, відавочна, доўга асэнсоўваў свой бунт супраць царкоўных улад. Асэнсоўваць было што – выступленні супраць уніяцкай іерархіі працягваліся па ўсёй Рэчы Паспалітай, пакуль не дасягнулі свайго апагею ў 1623 г. забойствам у г. Віцебску полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча. Відавочна, гэтая падзея і яе наступствы моцна паўплывалі і на айца Канстанціна. Падаецца невыпадковай дата замовы і ахвяравання ім у храм каштоўнага напрастольнага крыжа – 1625 г. Гэты год быў абвешчаны Рымскім Папам Урбанам VIII юбілейным годам – часам, калі можна было атрымаць дараванні грахоў пры выкананні пэўных умоў. Верагодна, і гэтая каштоўная ахвяра айца Канстанціна на карысць храма была адной з яго спроб ачысткі свайго сумлення. Напэўна, і прыпіска ва ўкладным запісу «Да*и*, Господі, емꙋ Цар*ст*во Небе*с*ное» была больш, чым стандартнай фармуліроўкай.

Пасля вайны 1654–1667 гг. крыж быў забраны да «Прачысценскай» (Замкавай) царквы, а пасля пераходу апошняй пад юрысдыкцыю базыльянскага ордэна ў 1680-х гг., ён на доўгі час патрапіў да збораў царквы Св. Барыса і Глеба, дзе і праляжаў да 1960-х гг., пакуль не быў вывезены музейнымі работнікамі ў г. Мінск.

## Крыніцы і літаратура

1. Chomik, P. Kult Ikon Matki Bożej w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI – XVIII wieku. – Białystok : Uniwersytet w Białymstoku, 2003. – 392 s.

2. Kempa, T. Konflikty wyznaniowe w Wilnie od początku reformacji do końca XVII wieku. – Toruń : Wydawnictwo naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika, 2016. – 800 s.
3. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 605. Ap. 8. B. 1243. – Дэканскія візіты цэркваў Навагародскага дэканата. 1795–1810 гг. – 100 арк.
4. Ultima ratio regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.: [міжнародная выстава, Мірскі замак, 21 красавіка – 24 верасня 2017 г.]: каталог / [аўтары тэксту: М. Волкаў, К. Карлюк]. – Мір : Музей «Замкавы комплекс «Мір», 2017. – 263 с.
5. Арт-Беларусь. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://artbelarus.by/be/gallery/443.html. – Дата доступу : 29.06.2015.
6. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при Управлении Виленскаго Учебнаго Округа (далей – АСДСЗР). – Вильна : Печатня О. Блюмовича, 1869. – Т. 6. – 422 с.
7. АСДСЗР. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1904. – Т. 14. – 289 с.
8. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: зборнік дакументаў / укладальнік Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 268 с.
9. Жукович, П. Последняя борьба духовенства митрополичьей епархии с Потеем и унией (1609–1611) / П. Жукович // Христианское чтение. – 1901. – № 9. – С. 370–389.
10. Лісейчыкаў, Д. В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2015. – 719 с.
11. Лісейчыкаў, Д. В. «Варуючы и милуючы малъжонку мою законную веньчалъную…»: жыццё і смерць мітрапаліта-«дваяжэнца» Анісіфара Дзевачкі / Д. В. Лісейчыкаў, І. М. Бобер // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 5. – С. 11–23.
12. Минские епархиальные ведомости. – 1871. – № 52. – С. 410–416.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 136 Воп. 1. Спр. 28773. – Справа аб пляцы Навагрудскай замкавай царквы, аддадзеным тамтэйшым гараднічым Зэнзбушам пад забудову лекару Карповічу. 10.08.1859–18.03.1860. – 16 арк.
14. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 5. Спр. 1. – Рэфармацыйныя дэкрэты да матэрыялаў генеральнай візітацыі цэркваў Навагародскага і Цырынскага дэканатаў. 1784 г. – 46 арк.
15. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8552. – Справа аб рэстаўрацыі старажытнай Барысаглебскай царквы як помніка рускай даўніны. 05.04.1914–12.05.1914. – 27 арк.
16. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 5. Спр. 40. – Фундушы, прывілеі і іншыя дакументы царквы ў в. Акаловічы Навагародскага пав. XVII–XIX стст. – 34 арк.
17. НГАБ. – Ф. 1502. Воп. 1. Спр. 13. – Генеральныя візіты цэркваў Навагародскага дэканата. 1754 г. – 61 арк.

18. НГАБ. – Ф. 1730. – Воп. 1. – Спр. 1. – Актавая кніга Новагародскага гродскага суда. 1656–1666 гг. – 534 арк.
19. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 587. – Генеральная візіта манастыра базыльянаў у г. Новагародку Новагародскага пав. 15.07.1824. – 30 арк.
20. НГМРБ. – КП 6984.
21. НГМРБ. – КП 8566.
22. Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям. – IX. – Новогрудский уезд. – Минск : Типо-Литография Б. Н. Соломонова, 1879. – 192 с.
23. Российский государственный исторический архив (далей – РГИА). – Ф. 823. Оп. 1. Д. 153. – Справа аб непрыняцці намінаваным кіева-пячэрскім архімандрытам Нікіфарам Турам пасвячэння ад кіеўскага мітрапаліта Міхаіла Рагозы. 10.04.1594. – 37 арк.
24. РГИА. – Ф. 823. Оп. 1. Д. 306. – Позва на каралеўскі суд новагародскаму сабornаму пратапопу Канстанціну Грыгор’евічу па справе аб яго адмове падпарадкоўвацца мітрапаліту Іпацію Пацею. 17.06.1609. – 1 арк.
25. РГИА. – Ф. 823. Оп. 1. Д. 589. – Выпіс з актавых кніг Новагародскага земскага суда аб замене мітрапаліцкага маёнтка Печураны з прыселкам Ляўнішчавічамі на маёнткі Новагародскай мітрапаліцкай капітулы Ляшневічы і Літоўку. 20.02.1631. – 12 арк.
26. Реєстр митрополичого архіву Унійної Церкви 1763 року / Упоряд. та вступ. ст. Олексія Вінниченка. – Львів : Видавництво УКУ, 2017. – 752 с.
27. Санкт-Петербургский институт истории Российской академии наук. Архив. – Ф. 52. Оп. 1. Д. 328. – Генеральныя візіты базыльянскіх манастыроў Літоўскай правінцыі. 1704–1705 гг. – 224 арк.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 02.09.2019

# Змест

**Архівазнаўства**

*О. И. Евстратьев*

«Куроника» в Эстонском историческом архиве в Тарту . . . . . . . . . . . 5

**Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў**

*Г. А. Бераставы*

Новыя дакументы XV ст. па гісторыі Віцебскай зямлі Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

*Я. С. Глінскі*

Працэс аб «нагане шляхецтва» ад 1562 г. і паходжанне зямянскага роду Браневічаў-Бранавіцкіх. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39

*Ю. М. Лаўрык*

Манускрыпты са слуцкімі правененцыямі ў калекцыі «Рукапісныя кнігі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. . . . . . . . . . 57

**Крыніцазнаўства**

*А. М. Латушкін*

Тэрміналагічнае афармленне комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў польскай гістарычнай навуцы і архівазнаўстве міжваеннага перыяду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80

*С. В. Полехов*

Грамота князя Фёдора Кориатовича 1391 г. и подольская дань «в Татары» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

**Гісторыя**

*З. В. Антановіч*

Пакаранні і спагнанні з праваслаўнага кліру Мінскай епархіі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. (паводле кліравых ведамасцей фонду «Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя»). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108

*И. С. Бутов*

Погоня за слухами об «аэропланах»
в Минской губернии в 1914 г.
(по материалам Национального исторического архива Беларуси) . . . . 118

*М. А. Волкаў*

Гакаўніцы ў Вялікім Княстве Літоўскім
паводле пісьмовых крыніц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131

*В. В. Калечиц*

Интеграция представителей свободного населения
Великого Княжества Литовского в состав шляхты
(на примере отдельных родов
Минского повета) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

*М. М. Кароль*

Змена матрыманіяльнага статусу як прычына
міжканфесійных канверсій у беларускіх губернях
Расійскай імперыі ў канцы XIX – пачатку XX ст. . . . . . . . . . . . . . 160

*Д. В. Лісейчыкаў*

«Сооружены ест коштом и накладом отца Константына»:
срэбраны напрастольны крыж з Навагародка і лёс яго стваральніка . . 170

*М. Д. Макараў*

Шклянкі, абаранкі і канвой: падарожжа купецкага абозу
з Прусіі ў Магілёў у 1718 г. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184

*А. У. Мацук*

Роля соймікавага дырэктара ў практыцы функцыянавання
адкладзеных павятовых соймікаў ВКЛ (1697–1717 гг.) . . . . . . . . . . 204

*О. В. Червинская*

Развитие медицинского обеспечения населения
Городокского уезда Витебской губернии
в XIX – начале XX в.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 220

## Гістарыяграфія

*Д. Ч. Матвейчык*

Расійская дарэвалюцыйная гістарыяграфія паўстання 1863–1864 гг.:
агульныя тэндэнцыі развіцця, дасягненні і праблемы . . . . . . . . . . 227

*С. Н. Рындин*

Иностранные подданные в Российской империи
в годы Первой мировой войны:
новые направления в отечественной и зарубежной
историографии 1990-х гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247

## Генеалогія

*Е. В. Хроленок*

Шляхетский род Околов-Кулак
на Стародубщине в XVII–XX вв. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 263

*Ф. В. Чарняўскі*

Сямейна-роднасныя сувязі і ўладанні
гараднічага кіеўскага Івана Рыгоравіча Служкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 271

## Рэцэнзіі

***Федута, А. И.*** Филомат в Империи : Документальная повесть о Франтишке Малевском / А. И. Федута. – Минск : Лимариус, 2019. – 464 с. – (Библиотека «Наш XIX в.») *(С. Л. Луговцова)* . . . . . . . . . . 285

***Cherner, E.*** Słownik biograficzny duchownych ewangelicko-reformowanych. Jednota Litewska i Jednota Wileńska 1815–1939 / E. Cherner. – Warszawa : Wydawnictwo Naukowe Semper, 2017. – 452 s. *(Ю. Н. Снапковский)* . . . . . . . . . . . 293

Рэзюмэ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 298

Резюме . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 306

Summary . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 315

Правілы для аўтараў «Архіварыуса» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .323

Guidelines for authors of «Archivaryus» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .325

A87 **Архіварыус:** зб. навук. паведамл. і арт. ; вып. 17 / рэд. В. Ф. Голубеў [і інш.]. — Мінск : НГАБ, 2019. — 336 с., іл.

**ISSN 2225-4412.**

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі падрыхтаваны сямнаццаты выпуск штогодніка «Архіварыус». На яго старонках асвятляецца шырокае кола пытанняў гісторыі, архівазнаўства, археаграфіі, крыніцазнаўства і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплін. У навуковы ўжытак уводзіцца шэраг новых, раней невядомых дакументаў і фактаў.

Прызначаецца архівістам, гісторыкам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца старонкамі мінулага Беларусі.

**УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]**
**ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41**